№293 15.01 Год 2013

САЛІДАРНАСЦЬ

У ІНТЭРНЭЦЕ

Спектакль «Хороший царь — плохие бояре» уже приелся даже невзыскательной публике

Геннадий КОСАРЕВ

15 января Александр Лукашенко хочет встретиться с 350 представителями белорусских (причем не только государственных) и зарубежных СМИ. Будут ли сенсации?

Не так давно глава государстве уже встречался с главными редакторами ряда СМИ — не только белорусских, но и зарубежных. А также не раз выступал перед прессой во время посещения белорусских предприятий.

Политолог Александр Класковский обращает внимание: официальный лидер постоянно нуждается в широком пиаре.

— И на этот раз приглашены журналисты негосударственных СМИ — это демонстрация того, что не боится глава государства острых вопросов, — говорит аналитик.

На предыдущей подобной пресс-конференции как раз несколько острых вопросов вызвали скандальные ответы. Классикой стал диалог с журналисткой «Народнай волі» Мариной Коктыш.

Бояться журналистов президенту, по понятиям руководства страны, не стоит — прошедший год был не худшим: удалось, по официальным данным, догнать зарплату до 500 долларов, устоял курс рубля.

— То есть, поводы для пиара, есть, — замечает Александр Класковский.

Но и неприятных вопросов президенту может быть немало. Например, по поводу невыполнения показателей по росту ВВП на 5-5,5%. Или снижения популярности белорусской власти. Рейтинг самого президента «примерз» на отметке около 30%, как свидетельствует опрос Независимого института социально-экономических и политических исследований.

Да и последние парламентские выборы показали, что народ совершенно не готов поддерживать власть посещением участков.

— Стена между руководством и народом стала такой степенью отчуждения, что это напрягает Лукашенко, — считает политолог. — Понятно, что на одних милицейских дубинках долго не удержишься. Работяг нужно подкармливать, а за счет пиара следует показать, что президент по-прежнему силен. Именно этим и были вызваны поездки главы государства на предприятия, которые оказались в провале.

Но тут, считает Александр Класковский, вопрос в том, насколько такая нехитрая парадигма может впечатлять белорусский электорат

— Спектакль «Хороший царь — плохие бояре» уже приелся даже невзыскательной части белорусской публики, — отмечает политолог.

Президент не станет менять пластинку

От предстоящей пресс-конференции эксперты не ожидают не только сенсаций, но и чего бы то ни было нового.

— Почти в каждом своем выступлении Александр Григорьевич выдает фразы, которые потом разлетаются на цитаты, но, учитывая, что вся эта волынка длится уже восемнадцать с половиной лет, по большому счету, идут сплошные повторы, — отмечает заместитель председателя Белорусской ассоциации журналистов Александр Старикевич.

По оценке Александра Класковского, последние интервью и пресс-конференции Лукашенко свидетельствуют о полном кризисе жанра.

— Причем поскольку глава государства уже длительное время не имеет полноценной обратной связи, и никто из его окружения не решается ему сказать, что какие-то его тезисы явно «не в дугу», он повторяет явно неудачные мысли, которые «не прокатывают», — отмечает эксперт.

Например, что в Беларуси нет ресурсов для диктатуры.

— Лукашенко не понимает, насколько абсурдно это звучит: он хочет доказать, что у него нет диктаторских замашек, а получается: дайте мне ресурсы, и я стану настоящим диктатором. Это высказывание явно работает против него, но президент уже дюжину раз его повторил в разных интервью, — констатирует Александр Класковский.

Но возможен «слив» конфиденциальной информации

По мнению Александра Старикевича, тем, которые журналистам хотелось бы обсудить с президентом, множество, но это точно не является целью пресс-конференции Лукашенко.

— У главы государства нет необходимости выносить проблемы на всеобщее озвучивание. Решения он принимает в единоличном порядке. Все остальное — это его театр одного актера, который говорит то, что считает нужным. Мы же не живем в демократическом государстве, где перед принятием решения нужно провести общественную дискуссию, собрать весь спектр мнений, учесть их, — подчеркивает эксперт.

Вместе с тем, поскольку белорусский президент часто увлекается и допускает экспромты, эксперты говорят о возможном «сливе» конфиденциальной информации. Однажды он уже выдал болезнь Путина на встрече с британскими журналистами, а также, похоже, озвучил численность КГБ, сказав, что их стоило сократить с одиннадцати до трех тысяч.

— То есть, бывают экспромты, которые выглядят пикантными и дают пищу для журналистов. Но ожидать, что Лукашенко скажет что-нибудь на уровне Ельцина в 1999 году – «я устал, я ухожу» - не приходится, — прогнозирует Александр Класковский.

ПОЛИТИКА

За что Лукашенко просил прощения в минувшем году

Руслан Горбачев

На предстоящей пресс-конференции ожидать от главы Беларуси покаяния за проблемы в экономике и внешнеполитическую изоляцию не приходится. Однако в 2012 году за некоторые вещи он прощения все же попросил.

Извинения за вульгарные и блатные выражения

Перед представителями СМИ регионов РФ: «Такого позора нации, как играла наша сборная, пусть даже с чемпионами мира, я не видел. Простите меня (не для СМИ сказано), «обкакавшись», выйти на поле, с дрожащими руками и ногами…»

Перед российскими журналистами: «В некоторые республики приедешь, так русского языка и не видно. Нигде нет надписей даже на русском языке — на ларьках, на кафе и борделях, извините меня».

Перед членами НОК: «Простите меня за этот слоган, но я предложил вам свою «крышу» в том числе для того, чтобы вы, спортсмены, тренеры и руководители спорта, могли спокойно делать свое дело».

Перед участниками совещания о ходе уборочной кампании: «Так же и губернаторы – все они мои люди, я за всех несу ответственность. Но, извините, и спрашивать буду на всю катушку».

В послании народу и парламенту: «У нас полный, извините меня, бардак, как Козик докладывал, на многих частных предприятиях»

Перед британскими СМИ: «Все зависит от комбинаций, от схем. И много фактов тому, что решение принимает один человек, и, извините меня, плевать на тот парламент Великобритании».

Перед представителями СМИ регионов РФ: «Мы начали создавать вместо участковых больниц больницы сестринского ухода... И закрепили, всех переписав людей, до их смерти, простите меня, мы их переписали и закрепили за этими больницами»

Извинения за пафос

Перед агентством «Рейтер»: «Ты себе должен при жизни, простите меня за это, воздвигнуть тысячи памятников, чтобы люди помнили, что это в твое время ты и твои коллеги это сделали для народа»

Перед депутатом: «Я никогда на это (на введение моратория на смертную казнь) сам не пойду. Я уже об этом говорил. Не пойду, потому что я слуга своего народа, простите за патетику»

Извинения за перебивание собеседника и затяжку времени

Перед представителями СМИ регионов РФ: «И я когда-то, я извиняюсь, что Вас перебил, я когда-то россиянам, еще во времена Ельцина, предложил…»

Перед российским журналистом: «А вообще, я извиняюсь, когда Вы начали говорить про Кабардино-Балкарию…»

Перед представителями СМИ регионов РФ: «И он же ко мне обратился с письмом, извините, что я у вас отнимаю время и рассказываю вот эту позавчерашнюю историю, обратился с письмом и пишет…»

Перед представителями СМИ регионов РФ: «Главное не болты и гайки, я часто об этом говорю, не солярка и бензин, а главное – люди. Я извиняюсь, что вы меня в эти эмоции ввергли…»

Перед белорусским журналистом: «Вы правильно намекнули, что это намек, извините за тавтологию».

Извинения за неподобающее поведение и мысли

На собрании, посвященном Дню Независимости: «И даже апологет нашего великого государства, некогда стоявший у руля, бедный забеспокоился. Жить-то осталось совсем немного, прости меня, Господь, за это, я так подумал, но все равно страдает, что Лукашенко, захватив власть, никуда не уйдет».

Перед журналистами, говоря о Грузии: «Надо не ловить сегодня министров обороны, извините, что я вмешиваюсь в это, ни других политиков».

Перед главным инженером «Камволя»: «Не сделаешь – посажу! Извини, что я так говорю, но выбора нет».

***

К вышесказанному остается лишь добавить, что по меткому замечанию того же Александра Лукашенко, «если ты, извините, дурак, то от журналистов этого не скроешь».

Очередная встреча официального лидера с репортерами состоится 15 января. На пресс-конференцию приглашено 350 журналистов из 285 СМИ.

На саммите «Восточного партнерства» не хотят видеть белорусские власти

Руководитель американской неправительственной организации Freedom House Дэвид Крамер призывает не приглашать представителей властей Белоруссии на организуемый в этом году в Вильнюсе саммит «Восточного партнерства» и Евросоюза (ЕС).

Находящийся в Литве Дейвид Крамер говорит, что было бы лучше, если бы Беларусь представляли не представители режима президента Александра Лукашенко, а активисты гражданского общества и правозащитники, сообщает DELFI.

“Я не считаю, что там должны быть представители белорусских властей, если сохранится нынешняя ситуация. Мне бы куда больше хотелось, чтобы Беларусь представляли активисты гражданского общества, правозащитники”, — отметил глава Freedom House.

“Я не говорю “никогда не разговаривайте с правительством”. Это нереально. Но не следовало бы предоставлять людям из правительства такую платформу, как “Восточное партнерство”, — сказал эксперт на дискуссии в среду вечером.

Беларусь входит в число шести соседей ЕС на Востоке, которые включены в программу “Восточное партнерство”. Однако ЕС и США ввели санкции в отношении представителей белорусского режима, обвиняя режим в репрессиях против оппозиции и ограничений прав человека.

Саммит ЕС и “Восточного партнерства” должен проходить в ноябре этого года в Вильнюсе. Литовские представители надеются, что на него приедут и руководители крупных стран ЕС.

Во время дискуссии, проходившей в посольстве США, Дэвид Крамер признал, что в 2006 году, когда он еще работал в Госдепартаменте США, в Вашингтоне ошиблись, пытаясь “насильственно” объединить раздробленную белорусскую оппозицию.

“Я не считаю, что дело Запада – Европы и США – насильственно объединять оппозицию. Думаю, что это не сработает. Мы пытались сделать это в 2006 году. Я сам в этом участвовал, и я думаю, что мы ошибались”, — цитирует слова Дэвида Крамера interfax.by.

Глава Freedom House подчеркнул, что Запад не вправе подбирать лидера оппозиции, который должен перенять власть, но сказал, что Европе и Америке следует активнее разъяснять, что с уходом А.Лукашенко условия жизни в Беларуси станут лучше.

Эксперт: Власти не хотят менять систему, удобную для фальсификации выборов

Геннадий КОСАРЕВ

Глава ЦИК Лидия Ермошина отклонила предложение оппозиционных партий и организаций провести общественное обсуждение поправок в избирательное законодательство. Почему власти так боятся публичного обсуждения собственных поправок в избирательное законодательство?

— Проект нормативного правового акта может быть вынесен на публичное (всенародное, общественное или профессиональное) обсуждение по решению государственного органа или должностного лица, уполномоченного принимать (издавать) нормативные правовые акты, — пояснила свое решение председатель Центризбиркома. Лидия Ермошина также считает невозможным проведение независимой экспертизы поправок в Избирательный кодекс со стороны БДИПЧ ОБСЕ и Венецианской комиссии, поскольку, по ее словам, это не предусмотрено белорусским законодательством.

Координатор кампании «Правозащитники за свободные выборы» Валентин Стефанович не удивлен подобным решением главы Центризбиркома. Правозащитник считает, что в Избирательный кодекс будут внесены только те изменения, которые разработал ЦИК.

— Это происходит уже не в первый раз. В Центризбиркоме неоднократно направлялись предложения, разработанные представителями оппозиционных партий и неправительственных организаций, но власти к ним не прислушались, — напоминает эксперт.

Валентин Стефанович отмечает, что сейчас наблюдается определенный откат от тех норм, которые были внесены во время президентских выборов 2010 года. К примеру, агитационные мероприятия тогда проводились в уведомительном порядке, не требовалось разрешение исполкомов. А сейчас такая практика будет урегулирована законодательно. То есть, призывы к бойкоту, которые раньше считались частью предвыборной агитации, будут регулироваться законом о массовых мероприятиях, требующим подачи соответствующей заявки в местные органы власти.

Правозащитник подчеркивает, что Лидия Ермошина не вправе отказать БДИПЧ ОБСЕ и Венецианской комиссии провести экспертизу поправок в Избирательный кодекс.

— Венецианская комиссия создана в рамках Парламентской ассамблеи Совета Европы, где статус наблюдателя имеет и Конституционный суд Беларуси. Так что, если соответствующие субъекты ПАСЕ, направят запрос на проведение тех или иных экспертиз, то согласие Ермошиной не потребуется. Кстати, Венецианской комиссией уже проводилась экспертиза статьи 193 прим УК Беларуси, касающейся Закона о массовых мероприятиях. Аналогичным образом может быть дана экспертная оценка поправок в Избирательный кодекс. Но, вряд ли, она что-то изменит, поскольку нет воли властей к созданию законодательства в духе Копенгагенского соглашения о свободных и демократических выборах и рекомендаций ОБСЕ, — считает юрист.

По словам эксперта, изменения коснутся лишь порядка выдвижения кандидатов в депутаты. Такую возможность получат общественные объединения численностью тысяча более человек.

-Это очень сомнительное нововведение. У нас получится какая-то квазисистема, когда провластные общественные объединения: БРСМ, «Белая Русь» и прочие, не являясь политическими партиями, будут напрямую выдвигать своих кандидатов в депутаты, — отмечает эксперт.

В то же время, по мнению эксперта, необходимо менять законодательство в части подсчета голосов и наблюдения за этим процессом. Тем более, что после каждых выборов ОБСЕ дает белорусским властям рекомендации о необходимости четкой детализации процедуры подсчета голосов, которая позволила бы обозревать этот процесс наблюдателям.

— Существующая система подсчета голосов направлена на то, чтобы было сложно предотвращать манипуляции и фальсификации. Процедуры не прописаны. Комиссия приступает к подсчету голосов, а как она это делает, законом не оговорено. На практике это выглядит так: каждый член комиссии считает свою пачку бюллетеней и все это происходит одновременно. Естественно, наблюдатель не может сделать вывод о результате голосования. Даже члену комиссии это неизвестно, поскольку он знает только то, что посчитал он. А как он может быть уверен, что другие считают честно, и, тем более, председатель комиссии, который что-то скалькулировал и вписал в протокол? Это очень удобная система для фальсификации итогов голосования, потому что процедура закрытая, и власти не хотят ее менять, — подчеркивает Валентин Стефанович.

Віцебская пенсіянерка абараніла «Ойча наш» праз ААН

Вышытыя чырвонымі ніткамі на белай тканіне словы міліцыянты расцанілі як плакат апазіцыйнага зместу,Камітэт па правах чалавека ААН абавязаў беларускія ўлады выплаціць пенсіянерцы кампенсацыю.

25 сакавіка 2008 году спадарыня Антаніна Піванос вырашыла зрабіць падарунак апазіцыянеру Барысу Хамайду – прынесла яму вышыванку са словамі малітвы «Ойча наш», паведамляе сайт праваабарончага цэнтру "Вясна".

Вышытыя чырвонымі ніткамі на белай тканіне словы міліцыянты расцанілі як плакат апазіцыйнага зместу. І Антаніна Піванос была пакараная штрафам у памеры дзьвюх базавых велічынь нібыта за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце.

Інцыдэнт адбыўся ў Дзень Волі каля так званага Сінёга дому, дзе спадар Хамайда распаўсюджваў незалежную прэсу. У той самы дзень адбыўся працэс у Чыгуначным райсудзе, дзе спадарыня Антаніна спрабавала пераканаць суддзю, што на ўручэнне падарунку, хай сабе і ў грамадскім месцы, не патрэбная санкцыя ўладаў. Тым не менш, суд скончыўся штрафам для актывісткі і канфіскацыяй "крамольнай" вышыванкі. Абскардзіць гэтае рашэнне не ўдалося ні ў Віцебскім абласным, ні ў Вярхоўным судзе...

Пасля звароту Антаніны Піванос у Камітэт па правах чалавека ААН прайшло больш за 4 гады, але рашэнне актывістка атрымала станоўчае. Згодна з ім, у дачыненні да спадарыні Піванос быў парушаны артыкул 19 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах. Паводле частка 2 гэтага артыкулу, грамадзяне дзяржаў – удзельніц Пакту, сярод якіх ёсць і Беларусь, маюць права на вольнае выказванне сваіх думак. Менавіта гэтае права жыхаркі Віцебску было незаконным чынам парушана.

ЭКОНОМИКА

Мясниковича пронесло

Ян Буян

Премьер-министр доложил Александру Лукашенко о текущей ситуации и рассказал, что будет считаться «преступлением».

Поскольку одна основных задач на 2012 год – рост ВВП на 5-5,5% – провалена, многие предвкушали порку главы правительства с последующей отставкой. Однако складывается впечатление, что Михаила Мясниковича пронесло: он может отделаться не самым строгим выговором.

– На фоне определенных успехов в экономике, о чем и вы уже в конце года говорили, и министры наши отмечают, но это видно, существует, конечно же, и ряд негативных факторов, которые не могут не настораживать, но по которым мы должны очень серьезно работать, – эта мудрёная фраза (цитируется по «БЕЛТА») принадлежит Александру Лукашенко, принявшему 14 января главу правительства с докладом.

Продолжил он в том же духе:

– Было бы странным, если бы это не происходило на фоне углубляющегося кризиса мировой экономики, по крайней мере в Евросоюзе, поскольку все-таки наше сотрудничество, как и с Российской Федерацией, паритетно очень высокое.

Вероятно, Лукашенко слишком доверился утверждению руководителя первички коммунистической партии при Республиканском интернате ветеранов войны и труда, который полагает, что в Беларуси «развивается экономика, в отличие стран Европейского Союза, где сегодня кризис, безработица».

Далее глава государства обратил внимание на низкий темп прироста ВВП, однако подчеркнул, что его больше беспокоит не этот фактор. Основной темы его беседы с премьер-министром стал «ход подготовки к масштабной модернизации производственного сектора».

В принципе, уже сейчас понятно, чем эта масштабная модернизация – «здесь не должно быть кампанейщины, но вместе с тем необходимо дойти до каждого предприятия» (еще одна максима от Лукашенко) – закончится. Когда её начинают на 19-м году правления, то возникает естественный вопрос: где же вы были раньше?

Единственный рецепт, озвученный Мясниковичем и попавший в официальное сообщение о встрече, тоже поражает своей глубиной и оригинальностью. Как отметил премьер-министр, каждое предприятие, каждый исполком, каждое министерство должны заниматься вопросами модернизации предметно, и это должно давать высокий результат.

– Потратить деньги и не получить новую продукцию – это преступление, – подчеркнул председатель Совета министров.

Коли так, то наш производственный сектор состоит сплошь из организованных преступных группировок...

Какой иностранный бизнес нашла и потеряла Беларусь

Алексей ТОПОЛЬКО

Белорусский рынок пока еще интересен зарубежному бизнесу. В прошлом году иностранных компаний, открывших свои представительства в Беларуси, было больше, чем свернувших свою деятельность.

За счет кого удалось достичь «положительного сальдо», и какой капитал убежал из страны?

Примерно половину представительств, открывшихся на территории Беларуси в 2012 году, создали российские компании.

В течение 2012 года, как свидетельствуют данные Министерства иностранных дел Беларуси, были открыты 158 представительств иностранных компаний. Из них 72 представляют интересы российского бизнеса. Свое присутствие на белорусском рынке в виде представительств оформили крупные российские компании: ОХК «Уралхим», «Авиакомпания «Сибирь», Национальная спутниковая компания, кемеровский «СДС-Холдинг».

На втором месте по числу открытых в прошлом году представительств Германия (10). На третьем — Литва (8).

Далее следуют Великобритания, Швейцария, Латвия (по 3 представительства), Бельгия, Турция, Швеция, США, Австрия (по 2), Дания, Румыния, Венгрия, Греция, остров Мэн, Болгария, Индия, Франция, ОАЭ, Канада (по 1-му).

По данным МИД, закрылись в 2012 году представительства 115 компаний. Из них 32 российских, 13 — украинских, 8 — немецких. В частности, прекратило деятельность представительство «Компании «Юнимилк», которая объединилась с российской дочкой французского холдинга Danone.

Среди шести представительств британских компаний, которые свернули свою деятельность в Беларуси, известный страховой брокер Beauchamp & Savrassov. В числе пяти кипрских компаний, оставивших нашу страну, инвестиционный банк Renaissance Investments. Также по пять представительств закрыли в Беларуси предприятия Латвии и Литвы.

В 2012 году прекратило деятельность представительство польской компании AKJ Capital, которая в 2010 году стала агентом №1 правительства Беларуси по привлечению инвестиций в белорусскую экономику. Польский бизнес «потерял» в итоге четыре представительства, столько же — чешский и итальянский.

Далее следуют Гонконг и США (по 3), Австралия, Австрия, Турция, Иран, Нидерланды и ОАЭ (по 2).

Прекратила в 2012 году свою деятельность в Беларуси Иранская национальная нефтяная компания: «Белоруснефть», как известно, вышла из проекта по освоению месторождения Джофеир и тесные контакты оказались излишними.

Закрылись также представительства компаний Словакии, Дании, Швеции, Молдовы, Болгарии, Сингапура, Израиля, Новая Зеландии, Маврикия, Азербайджана и Франции.

Эксперт: Власти перед выбором: промышленный вал или финансовый обвал?

Николай ВИКТОРОВИЧ

Пожертвуют ли власти финансовой стабильностью в угоду экспортерам и хватит ли у Минпрома сил гнать вал — реальность планов правительства по темпам роста производства на 8% и достижению положительное сальдо внешней торговли в 3 млрд. 750 млн. долларов оценивает эксперт Либерального клуба Антон БОЛТОЧКО.

— В прошлом году предприятия Минпрома дали самый большой прирост, поэтому в 2013-м выполнить валовые показатели будет сложнее. Но их можно регулировать ручным управлением, работая на вал. Если такой приказ поступит, его можно выполнить, но при условии, что дадут дешевые кредиты или субсидии в размере 1-1,5 млрд. долларов. Этого хватит для роста промышленного производства на 8%.

— Пойдут ли на это белорусские власти?

— Власти стоят перед выбором: либо финансовая стабильность, либо валовые показатели. Я делаю ставку на то, что валовые показатели будут на втором месте, а власти, прежде всего, обратят внимание на стабилизацию финансового сектора, который сейчас чувствует себя не очень хорошо: в декабре Минфин направил 8 триллионов белорусских рублей на рекапитализацию страховых компаний.

Я думаю, г-н Прокопович как экономический советник будет убеждать Лукашенко, что финансовая стабильность важнее.

— То есть, дешевых денег промышленности не дадут?

— На всех просто не хватит господдержки. Некоторых — поддержат. Все остальные будут стагнировать.

— А реально ли увеличить рентабельность промышленных предприятий на 12%?

— Рентабельность — показатель, которым можно манипулировать. Если прикажут, то бухгалтерии предприятий его смогут нарисовать. Но кому от этого лучше? Реально повысить рентабельность не удастся. Ведь доля импортных комплектующих очень велика. И если будут увеличивать их закупки, то и стоимость конечного товара будет расти. В таких условиях вряд ли удастся выйти на высокую рентабельность.

Тем более, что значительно вырастет конкуренция, поскольку на рынке Таможенного союза появятся китайцы. На Европу мы и сами не ориентируемся. Да и белорусские промышленные товары не того качества, чтобы конкурировать с западными.

— Цифра, которую невозможно нарисовать — увеличение экспорта. Реально ли Минпрому увеличить его на 17% и достичь положительного сальдо в 3 млрд 750 млн долларов?

— Действительно, здесь не обманешь никак. Сразу скажу: данный показатель практически не выполним. Нет в Беларуси предприятий, которые могут дать такой рост. Очевидно, эти показатели принимались с надеждой получить в полном объеме дешевую российскую нефть. Но Москва подходит к этому вопросу очень осторожно. Определенности с поставками нефти на весь год нет.

Вторая возможность увеличить экспорт — за счет роста поставок на российский рынок. Но вряд ли у России будет такой большой спрос на белорусскую продукцию. Тем более, что по некоторым позициям мы конкурируем с россиянами. Мой прогноз: в лучшем случае удастся выйти на минимальное положительное сальдо 1 млрд долларов. Не больше.

— А что может спасти белорусскую промышленность?

— Модернизация. А для этого нужны огромные инвестиции. Власти, скорее всего, просто будут поддерживать на плаву предприятия, на большее денег не хватит. У нас же реально зарабатывают порядка 50 промышленных предприятий.

— Может, хотя бы безысходность подтолкнет власти к массовой распродаже убыточных?

— Массовой приватизации не будет: власти ее боятся, чтобы не утратить контроль. Продадут несколько активов на необходимые 2 млрд долларов, чтобы продержатся этот год. А на будущее никто не загадывает.

— Тем не менее запланирован рост средней зарплаты на предприятиях Минпрома с 560 до 675 долларов. За счет чего?

— А вот это как раз-таки вполне вероятно. За счет кредитной эмиссии. Но чревато инфляцией. Нацбанк таким повышениям будет сопротивляться.

— И спасать экспортеров за счет девальвации власти тоже не будут?

— Я думаю, резкой девальвации не будет в этом году. Она будет плавной: до 9100 рублей за доллар, возможно, чуть больше.

Квартиры на вторичном рынке Минска подорожают на 5–7%

При сегодняшней ситуации в коммерческом строительстве и стабильном курсе рубля до мая квартиры на вторичном рынке Минска подорожают еще минимум на 5-7%.

Так считает председатель совета Белорусской ассоциации «Недвижимость» Николай Простолупов. По его словам, за последние месяцы 2012 года квадратный метр в стандартных квартирах подорожал примерно на $ 60—90, то есть на 6—8%.

Как пишет газета «Звязда», еще недавно на вторичном рынке недвижимости можно было найти неплохую 1-комнатную квартиру стоимостью до $ 40 тыс. Сегодня же в спальных районах стандартные «однушки» общей площадью от 33 до 40 квадратных метров предлагаются за $ 45—55 тыс. При этом на цену прежде всего влияют месторасположение и год постройки дома, состояние квартиры, расстояние до метро, наличие рядом социальной инфраструктуры, зеленой зоны и крупных торговых объектов. Просторные «однушки» в относительно новых девятиэтажках стоят уже от $ 55 до 65 тыс.

Минимальная стоимость 2-комнатных квартир составляет от $ 46 до 52 тыс. Еще в ноябре подобные квартиры-«хрущевки» в старых домах предлагались за $ 44—49 тыс. Обычные «двушки» в панельных 9-этажных домах оцениваются в $ 53—70 тыс. Стандартные по площади варианты с качественным ремонтом и современной мебелью или квартиры в элитных домах предлагаются за $ 100—160 тыс.

Стартовая цена маленьких 3-комнатных квартир начинается с $ 60 тыс. За эти деньги можно купить «хрущевку» со смежными комнатами и общей площадью от 55 до 62 кв. м. Прошлой осенью такие квартиры оценивались на $ 3—5 тыс. меньше. Стандартные «трешки» общей площадью до 80 метров стоят в диапазоне от $ 75 до 95 тыс. При этом покупатели дорогой недвижимости все чаще предпочитают квартиры с хорошим ремонтом.

ОБЩЕСТВО

«Сістэма каардынат Лукашэнкі зменіцца, а добры пісьменнік застанецца»

Таццяна Гусева

У межах праекта «Жыццё (не)звычайнага беларуса» старшыня Беларускага ПЭН-цэнтра Андрэй Хадановіч распавёў пра тое, як ён даў аўтограф Байрану, чаму нашым паэтам могуць зайздросціць замежныя калегі, і як ён змагаецца з дыктатарам у сабе.

«Беларускі мужчына выдатна ведае дзесяць бульбяных страваў

і сто дзесяць адмазак ня чысьціць бульбы, бо мае шмат іншых справаў.

Беларускі мужчына жыве ў самым цэнтры Эўропы, калі верыць мапе:

ў гэтым цэнтры стаіць канапа і беларускі мужчына ляжыць на канапе».

Калі ўпершыню пачула гэтую песню на словы Хадановіча, думала, абавязкова запытаю жонку паэта, які ён у побыце. І вось я ва ўтульнай кухні паэта, перакладчыка і барда. Гаспадар частуе мяне гарбатай, а ягоная гарэза-дачушка Аленка сядзіць побач са мной і гуляецца ў журналістку, кладзе градуснік побач з маім дыктафонам.— Марына, скажыце праўду, верш пра беларускіх мужчын Хадановіч з сябе пісаў?

— Жахлівыя мужы-паэты ў побыце, бо ім заўсёды хочацца што-небудзь пісаць, ствараць у той момант, калі, напрыклад, трэба папыласосіць ці вынесці смецце — гэта класіка жанра, — смяецца Марына.

— А калі не трэба пыласосіць, часам і муза спакойная, — парыруе Андрэй.

— Але ён гераічна кідае свае заняткі і пачынае рабіць хатнія справы, — працягвае Марына. — Адзінае, што звышгераічных, кшталту рамонту пыласоса ці кампутара, я ад Андрэя не патрабую. На гэта тэхнічныя мазгі патрэбныя, а не паэтычныя. А каб выйсці на гадзінку, а вярнуцца праз тры дні — такога не бывае.

— Асцярожна. Не падавай мне ідэяў! — радасна падхоплівае Хадановіч.

— А яшчэ ні ў мяне, ні ў Андрэя няма правоў. Ездзім мы звычайна грамадскім транспартам, таму машына мне не сутперніца, — гаворыць Марына.

— А тым дзяўчатам, якія мараць выйсці замуж за паэта, вы б што параілі?

— Памятаеце эпізод у фільме «Москва слезам не верит», калі гераіня Мураўёвай глядзіць на вельмі прывабнага генерала, якога бярэ пад ручку і ўводзіць ад яе нейкая цётка. «Ну, вось чаму, чаму мне не сустракаюцца ў жыцці такія генералы?» — пытаецца яна. А яе калега кажа: «Для таго, каб стаць генеральшай, трэба выйсці замуж за лейтэнанта, ды паматацца з ім па гарнізонах…».

Гісторыя нашых стасункаў пачалася з першага курса, з адной парты. Я памятаю Андрэя, калі ён яшчэ не быў беларускім паэтам. Ён быў студэнтамфілолагам рускага аддзялення. Пісаў вершы на рускай мове. Калі я выходзіла за яго замуж, часопіс « ARCHE» пісаў пра паэтычнае адкрыццё 1998 году Андрэя Хадановіча. То бок я ўжо выходзіла замуж за “адкрыццё”.

— Марыну часопіс «ARCHE» папярэдзіў, але ніхто не папярэджваў маю маму, якая прыехала ў 16 год з Расіі, пабралася шлюбам з беларускім хлопцам, потым чытала дзіцёнку казкі Пушкіна, а ён вырас – і такую свінню падкладае, пераварваецца ў беларускамоўнага, — дадае іранічным тонам Хадановіч.

Марына: — Мама Андрэя дагэтуль пагладае на сына і думае, як такое атрымацца магло. Але, безумоўна, ганарыцца ім і дзівіцца таму, што ў яе нарадзіўся беларускі паэт.

Трапіць у госці да Хадановічаў было няпроста. На сустрэчу я дамаўлялася з Марынай, бо ў самога гаспадара сямейства няма мабільнага тэлефона. Дакладней, ёсць, але ён ім карыстаецца выключна ў замежных паездках. І вось з-за гэтых вандровак застаць дома гаспадара на працягу некалькіх месяцаў аказалася немагчымым.

— У мяне заўсёды была патрэба ў падарожжах, — прызнаецца Андрэй. — Гэта дае магчымасць знаходзіць новых сяброў і знаёмых, бачыць новыя твары слухачоў альбо суразмоўнікаў, глядзець на іншыя кавалкі свету. Мая ангельская застаецца ўсё такой жа кепскай, але – парадокс – я ўсё лепей на маёй кепскай ангельскай размаўляю.

У мінулым годзе я правёў месяц у Парыжы, каля тыдня ў Брусэлі, пару дзён у Стакгольме. Ездзіў у Паўднёвую Карэю і каля трох месяцаў правёў у ЗША.

— Марына, вы адчуваеце сябе жонкай капітана далёкага плавання? — пытаюся ў гаспадыні, якая завіхаецца на кухні з цестам.

— Часам адчуваю. Але калі ёсць такая магчымасць, Андрэй стараецца нас з дачкой вазіць з сабою. Аленка Андрэеўна ездзіць з намі прычэпам і на семінары, і на паэтычныя фестывалі. А калі Андрэй атрымаў стыпендыю ў Парыжы, мы з Аленкай прыязджалі да яго на тыдзень, і гэта было цудоўна.

Я прызвычаілася да ягоных падарожжаў. Бачу, што паездкі плённыя для Андрэя. Існаванне дома, хатняя гаспадарка — яны часам замінаюць творчасці. Часам перашкоды бываюць вясёлымі, калі Аленка лезе за кампутар, перашкаджаючы працаваць, і планы што-небудзь перакласці ці напісаць адкладаюцца. Часам — сумнаватыя, калі, напрыклад, у дачкі вушка пачынае балець, вось, як сёння.

— Андрэй, вы ў «чорным спісе» літаратараў ці не? — галоднаму Хадановічу гэтае пытанне і не наважылася б задаць.

— Сціпла і не адказваш. Пачну здалёк. Беларуская форма маніі веліччы — гэта манія пераследу. І наадварот можна сказаць. Неяк ідзем мы разам з Уладзімірам Някляевым праводзіць заняткі школы маладога літаратара. У той самы месяц насупраць увахода ў офіс, дзе тыя заняткі ладзяцца, спілавалі адно з дрэваў. Насупраць іншых пад'ездаў дрэваў не чапалі. Дык вось супрацоўнікі офісу жартавалі, што так лягчэй за Някляевым назіраць. Я Уладзіміру Пракопавічу кажу: «Дрэва спілавалі з моманту вашага прыходу!». — «Ды ну, не кажы дурное!» — махае рукой спадар Уладзімір. А ў самога аж вочы загарэліся…

Ясна, што ён сціпла аджартаваўся. Але ёсць такая форма чыста беларускага прызнання: часам нянавісць, а часам— зайздрасць. Часам — сістэмнае гнабленне. Калі казаць пра чорныя спісы, думаю, што ў мяне ў розныя перыяды было па-рознаму. Скажам, на пачатку 2000-х мяне актыўна запрашалі на тэлебачанне — барані Божа, без палітычных выказванняў — на канал «Культура». Скажам, каб паразважаць пра аўтарства п'ес Уільяма Шэкспіра. А ячшэ дзесьці ў сярэдзіне 2000-ых на канале «Культура» Беларускага радыё была рубрыка, дзе я раз на тыдзень расказваў пра кніжкі, якія прачытаў.

У сакавіку 2006-га,

ОБЩЕСТВО

пасля таго, як я агучыў адзін са сваіх вершыкаў на Плошчы, знаёмая дзяўчына патэлефанавала з «Культуры» і сумным голасам прамовіла: «Спадар Андрэй, мы назаўтра збіраліся з вамі сустрэцца, дык вось не будзе перадачы з вамі пра Джэнет Уінтэрсан». Так цудоўная ангельская пісьменніца стала закладніцай беларускай палітыкі.

Пэўнае табу дзейнічала з 2006 па 2008 год. Але ў выдавецтве Логвінава кніжкі выходзілі, пераклады. Адбываліся прэзентацыі. Той жа "ЛіМ" павінен пра штосьці пісаць, але стыль газеты быў такі: згадваецца замежны аўтар, але не згадваецца яго беларускі перакладчык; згадваюцца замежныя ўдзельнікі фестывалю, але не называюцца пэўныя беларускія прозвішчы.

Нават калі б гэтых чорных спісаў не было ў наяўнасці, яныз пэўнасцю ёсць як сума паранояў і ўнутраных цэнзараў усіх супрацоўнікаў дзяржаўных структур. Гэты чорны спіс ёсць у галаве рэдактара, які беспамылкова выкрэсліць, скажам, прозвішча Барадуліна, нават без спецыяльнага ўціску зверху. Тое самае з прозвішчамі Бураўкіна, Арлова, некаторых іншых. З 2006 па 2008 рука рэдактара не вагалася выкрэсліваць Хадановіча з такіх матэрыялаў.

— А што здарылася ў 2008-ым?

— Ва ўлады ёсць свае гульні. Унутры сістэмы ёсць свае лібералы (ці, хутчэй, тыя, што хочуць здавацца лібераламі) і свае кансерватары, свае аматары бізуна і свае аматары перніка, свае добрыя і кепскія следчыя, якія працуюць тандэмам дзеля агульных мэтаў. У 2008-ым быў кароткі перыяд пернікаў.

Мной актыўна цікавілася «Саўбелка», прапаноўвала друкаваць вершы і даваць інтэрв'ю. Прычым прысылала найбольш сімпатычных мне людзей. У 2006-ым або ў снежні 2010-га, напрыклад, я б на такую сустрэчу не пайшоў, бо яшчэ пытанне — што будзе на суседніх старонках гэтай газеты.

У перыяд пернікаў па ініцыятыве дзяржаўнага выдавецтва рыхтавалася кніга маіх перакладаў. Прадмову напісаў Лявон Баршчэўскі, тагачасны кіраўнік БНФ. Легендарны Міхал Анемпадыстаў афармляў вокладку. Але ў гэтых гульняў ёсць свае межы. У канцы 2008-га года мяне абралі старшынём беларускага ПЭНа. Вось тут была кропка, дзе чаша цярпення перапоўнілася. І раптам спыніліся званкі з выдавецтва. А калі я зрабіў дзяжурны званок, мне пачалі казаць штосьці няўцямнае: «Ведаеце, сітуацыя з накладам змянілася. Мы не можам выдаваць кнігі без спецыяльнай падтрымкі альбо папярэдняй падпіскі. Можаце забяспечыць нам папярэднюю падпіску 500 асобнікаў па бібліятэках?». На гэтым мы ветліва развіталіся.

— Але вам не перашкаджаюць выкладаць на філфаку?

— Так, мяне ніхто не звальняў – ні ў 2006-м, ні нават у 2010-м годзе.

Але пасля прысуджэння шведскім ПЭН-клубам узнагароды імя Тухольскага спадару Някляеву я паехаў на цырымонію і атрымаў за яго дыплом. З гэтага моманту пачалася серыя дробных помстаў з боку розных ананімаў.

У мяне складваецца ўражанне, што як толькі я перасякаю мяжу і даю памежнікам свой пашпарт, як інфармацыя пра гэта адразу трапляе, куды след.

Я шмат езджу, але у мяне ёсць свае працоўныя універсітэцкія абавязкі, якія я нязменна выконваю. Не заўважаў за сабой ніколі, каб не вычытаў нейкіх лекцый. Часам здаралася, калі лекцыя пераносілася, напрыклад, з аўторка на чацвер. Да пары да часу я не меў з гэтым асаблівых праблем, а потым яны пачалі множыцца, як лавіна.

На кожнае перасячэнне мяжы была рэакцыя. Нейк маё кіраўніцтва атрымала ананімку, замаскаваную пад ліст, нібыта напісаны ад першай асобы нейкім Андрэем Хадановічам, які здурэў да такой ступені, што сам расказвае начальству, як ён парушае працоўную дысцыпліну, з'язджаючы кудысьці. У лісце з падробленым подпісам, з граматычнымі памылкамі, гэты прыдуманы Хадановіч пісаў, як ён едзе ў Грузію ці ва Ўкраіну і там хораша ў працоўны час адпачывае, купляе сабе куртку (!)... Далей прыгожая гісторыя пра горад, у які я не ездзіў. Усё ў гэтым лісце было няпраўдай, акрамя аднаго — перасячэння беларуска-украінскай мяжы. Шчыра спачуваю ў такіх гісторыях свайму начальству, якое яшчэ робіць усё, каб паводзіцца прыстойна...

...Я стаўлюся да свайго выкладання як фаталіст. Я не змагу супрацьпаставіць нічога свайму звальненню, калі мяне моцна захочуць звольніць. Мой родны універсітэт плаціць мне столькі, што я магу толькі паўтарыць славутае выказванне Карла Маркса "пра няма чаго губляць". Бо кожны з нас у Беларусі на дзяржаўнай пасадзе такі сабе эксплуатаваны пралетарый, які атрымлівае заробак, неадпаведны свайму інтэлекту. Гэтая сістэма не мае перніка, якім магла б мяне спакусіць, але не мае і бізуна, якім магла б мяне напалохаць.

З іншага боку, кожны студэнт — прадстаўнік новай маладой генерацыі. Мне цікава, што адбываецца ў свядомасці людзей, маладзейшых за мяне. Уваходзячы ў аўдыторыю іназіраючы за студэнтамі, я шукаю адказ: ці можам мы на штосьці спадзявацца. Ад гэтага досведу мне было б крыўдна адмовіцца. Гэта самае прыемнае, што трымае мяне ва ўніверсітэце. Але, паўтаруся, трэба аддаць гэтай сістэме належнае: у 2006-м я хадзіў у намётавае мястэчка і выканаў пры гэтым сваю працоўную нагрузку – і мяне ніхто не звольніў.

Марына: — Памятаю, як у сакавіку 2006-га звоніць студэнтка. У голасе слёзы: «Скажыце, Андрэя Валер'евіча не звольнілі з працы? А ён прыйдзе да нас заўтра на лекцыі?». Гэта быў такі кранальны званок... Студэнты шчыра пераймаліся за яго.

Андрэй з ранку ішоў на лекцыі, пасля ў мястэчка. Паколькі я была на восьмым месяцы цяжарнасці, ён гадзіне а дванаццатай вяртаўся дахаты, бо я ад яго гэта патрабавала – не заставацца там начаваць.

— Андрэй, у адным інтэрв'ю вы сказалі, што ў нашых апазіцыйных палітыках бачыце маленькіх лукашэнкак, і ў гэтых людзей няма сіл узяць уладу. Але калі б яны яе атрымалі, магчыма, аказаліся б больш таталітарнымі, чым Лукашэнка. Ці змянілася ваша пазіцыя?

— Я кіруюся двума прынцыпамі: пункт першы — любая палітыка — гэта бруд і прыцягвае людзей пэўнага характару. На жаль, у кожным чалавеку яна праяўляе не найлепшыя якасці. Пункт другі: калі табе падабаецца нейкі палітык, глядзі пункт першы. Значыць, у яго лепшыя іміджмейкеры, чым у яго калегаў, якіх ты раскусіў адразу.

Тым не менш, ёсць сімпатычныя мне людзі, якія "ўляпаліся" ў беларускую палітыку. На выбарах у 2010-ым я галасаваў супраць усіх.

Але мне сімпатычная пазіцыя чалавека, які вычарпаў літаратурныя сродкі свайго ўплыву на беларускае грамадства і апошняй мерай палічыў паход у палітыку. Яго паспяховасць на фоне іншых сведчыць пра тое, што некаторыя прадстаўнікі апазіцыі дзесяцігоддзямі толькі імітавалі заняцце палітыкай. Гэта значыць, што харызматык, таленавіты чалавек з іншай сферы можа прыйсці ў палітыку проста з вуліцы – і іх усіх зрабіць!

Окончание на с.8

ОБЩЕСТВО

Окончание.
Начало на с.6

Мне здаецца, сярод беларускіх палітыкаў няма чагосьці сярэдняга паміж крайнасцямі. Ёсць альбо людзі, здольныя да нейкага рэвалюцыйнага ўчынку, альбо нааадварот, спакойныя, мудрыя, узважаныя кабінетныя функцыянеры, кшталту спадара Мілінкевіча. Але часам сітуацыя патрабуе пераскочыць праз свой плот і зрабіць штосьці крэатыўна нечаканае. Вось шчаслівага спалучэння лідарскіх здольнасцяў з прыстойнасцю і інтэлектам, якім бы я верыў кожны дзень, на жаль, не бачу. З іншага боку, у мяне ёсць правіла: нікога не асуджаць, асабліва чалавека, які трапіў у горшыя, чым ты, умовы. Ніколі не ведаеш, як паводзіў бы сябе ты.

— А ў вас таксама жыве дыктатар? Як ён праяўляецца?

— Я думаю, што дыктатар жыве ў кожным чалавеку. Ці заўсёды мы спрачаемся дзеля таго, каб пачуць іншага? Ці заўсёды мы задаем пытанні, каб пачуць адказ? Ці адказ будзе харошы той, які супадае з нашым меркаваннем? Я стараюся змагацца са сваім унутраным “лукашэнкам” у зародку. Я разумею ўсіх палітыкаў, якія сварацца, рукі адно аднаму не падаюць, падсрачнікі даюць у адказ, ведаю, што ўсе яны гэтага ў прынцыпе заслугоўваюць.

Дастаеўскі казаў: «Д’ябал з Богам змагаюцца, а поле бітвы – душы людзей». У кожным з нас у нейкі момант перамагаюць белыя ці чорныя фігуры. У палітыцы чорныя фігуры перамагаюць нашмат часцей, чым у іншых сферах. Чаму беларуская тэрыторыя літаратуры адносна спакойная? Возьмем нашых старэйшых калегаў, якія ў савецкія часы прывыклі да сітуацыі літаратуры-кармушкі. У часы перабудовы яны перасталі пісаць пра Леніна. Веру, што яны шчыра змянілі свае думкі, адкрылі для сябе новыя каштоўнасці. Цяпер гэтыя людзі бурчаць, што раней дзяржава падтрымлівала культуру і беларускую літаратуру ў прыватнасці. Але ўсякі таталітарызм у XX стагоддзі спрабаваў спакусіць, падмануць, выкарыстаць і выплюнуць творцаў. Часам інтэлектуалы давалі сабе на кароткі час задурыць галаву, падмануцца... І гэтыя людзі сёння будуць наракаць, што няма кармушкі! І дзякуй Богу, што сённяшняя ўлада калгасная настолькі, што не разумее магчымасцяў слова. Яны прыдумалі марыянеткавы саюз пісьменнікаў, які не здольны стварыць нешта сваё і толькі займае чужую тэрыторыю. Яны гуляюцца ў біятлон, а не ў культуру, ім не цікавая беларуская мова як мова школьнага навучання. Так, гэта небяспека для мовы, для культуры ў масштабе краіны, але разам з тым для кожнай творчай асобы гэта дадатковы шанец не шукаць выгады, а застацца самім сабой.

— Калі спытацца на вуліцы, каго вы ведаеце з сучасных беларускіх літаратараў, баюся, што людзі будуць называць памерлых творцаў альбо тых аўтараў, якіх вывучалі ў школе. Што магло б пераламіць гэтую сітуацыю і вывесці беларускую літаратуру з гета?

— З кожным днем літаратура ў свеце маргіналізуецца, а ў самой літаратуры асабліва маргіналізуецца паэзія. Але ў Беларусі тое, што ўмеюць і могуць рабіць літаратары, не да канца адпавядае гэтым сусветным працэсам. Найлепшая частка найбольш крэатыўных беларускіх пісьменнікаў на сёння ведае пра паэзію больш, чым пра тое, як зрабіць харошы чытабельны сучасны раман. Элементарная эканоміка. Раз-пораз пішучы ў блог верш, існаваць, матэрыяльна выжываць прасцей, чым засяродзіцца на напісанні 600-старонкавага раману. Вось, скажам, маладая пісьменніца Юлія Шарова выдала ў электроннай версіі свой дэбютны раман, але ў яе працэс напісання і давядзення да ладу заняў каля дзесяці гадоў. Я разумею, што жыццё сёння ў Беларусі не спрыяе таму, каб маладыя пісьменнікі пісалі тоўстыя раманы.

На Захадзе літаратурай цікавяцца не больш, чым у Беларусі, і сур’ёзная літаратура займае не большае месца сярод мора абы-чаго. Але там прыдумалі пэўныя сістэмы сацыяльнай падтрымкі літаратара, які не вытрымлівае рынкавай канкурэнцыі. А гэта большасць паэтаў, аўтараў раманаў – не бестсэлераў. Не могуць усе пісаць пра Гары Потэра. Не могуць усе сур’ёзныя пісьменнікі зайграваць з масавай культурай і ставараць поп з інтэлектуальнага прадукта, як Умберта Эка. Аднаму ўдаецца, а тысячам іншых — не. Але для іх існуюць выступы на кніжных кірмашах і літаратурныя чытанні, дзе кожны атрымлівае ганарар, не меншы за ўсталяваны стандарт. Магчымасць творчых стыпендый дазваляе заходняму пісьменніку не рабіць абы-што любой цаной, каб заваяваць свае пяць капеек на рынку ці пятнаццаці хвілін уорхалаўскай славы, а рабіць тое, што ён рэальна хоча і бачыць сваёй задачай.

У амерыканскіх універсітэтах ёсць спецыяльнасць creative writing. Для студэнтаў праводзяць майстар-класы пісьменнікі, якія могуць атрымліваць з гэтага някепскія фінансавыя дывідэнды. Вельмі актыўна паэтаў і празаікаў запрашаюць на універсітэцкія чытанні, сустрэчы са студэнтамі, лекцыі. Такая падтрымка не дасць літаратарам памерці з голаду, як гэта часта адбывалася з найлепшымі пісьменнікамі розных эпох. Можа быць, таму буржуазная дэмакратыя з усімі сваімі бясспрэчнымі недахопамі для мяне меншае зло, чым тое, што існуе ў нас.

Сёння беларускі пісьменнік не абаронены нічым, апроч сумнеўных дзяржаўных падачак у сваёй краіне, якія чалавек з сумленнем наўрад ці захоча ўзяць. Але, як бы ні было кепска добрым беларускамоўным пісьменнікам, яшчэ горш, магчыма, у Беларусі іх рускамоўным калегам, якія не ёсць пры гэтым генераламі міліцыі і рознай ступені прадажнасці графаманамі. У іх ёсць каштоўнасці, якія моцна разыходзяцца з беларускай уладай. Дзе гэтым людзям друкавацца?

Яны аказваюцца не патрэбныя ні дзяржаўным структурам, але яны не ёсць да канца сваімі ў асяродку беларускамоўнай інтэлігенцыі, прадстаўнікі якой з падазронасцю ці зайздрасцю будуць глядзець на іх. Нельга ж уголас прызнацца, што проста зайздросціш поспеху Святланы Алексіевіч, якая перакладаецца на ўсе магчымыя мовы і збірае прэміі. Лепей сказаць, што яна “не наша”.

Некаторыя мае калегі кажуць, што беларускі пісьменнік – гэта выключна той, хто піша на беларускай мове. Прычым кіруюцца падвойнымі стандартамі, бо тыя ж людзі будуць казаць: Адам Міцкевіч — гэта наш, беларускі аўтар. Хацелася б канчаткова паздымаць усе гэтыя дурацкія падзелы па моўным прынцыпе. І Міцкевіча хопіць на ўсіх: і палякам, і літоўцам, і беларусам. Былі б харошыя пераклады. І рускамоўныя літаратары, якія жывуць у Беларусі, пішуць пра Беларусь і, галоўнае, самі лічаць сябе беларускімі літаратарамі – безумоўна, нашы. А калі яны яшчэ і таленавітыя – то гэта проста скарб, адмаўляцца ад якога – чыстая дурасць.